УДК 94(476) “1919/1939”:314

# КАНФЕСІЙНАЯ СТРУКТУРА НАСЕЛЬНІЦТВА ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1919–1939) У АДЛЮСТРАВАННІ ПЕРАПІСАЎ НАСЕЛЬНІЦТВА: ПОЛЬСКАЯ ГІСТАРЫЯГРАФІЯ

**Цымбал Аляксандр Георгіевіч,**
Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт (г. Мінск, Беларусь)

*Артыкул прысвечаны вывучэнню польскай гістарыяграфіі канфесійнай структуры насельніцтва Заходняй Беларусі паводле перапісаў насельніцтва, якая прадстаўлена крытычным і апалагетычным накірункамі.*

Тэрыторыя Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы ўяўляла шматканфесійны і шматнацыянальны рэгіён. Насельніцтва характарызавалася рознымі ўзроўнямі развіцця нацыянальнай ідэнтычнасці, адрознівалася моўна і рэлігійна. Былі прадстаўлены групы з дастаткова сфарміраванай самасвядомасцю, але прысутнічалі і жыхары, сярод якіх працэсы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

не былі завершаны. Вызначальную ролю, такім чынам, працягвала адыгрываць канфесійная ідэнтычнасць, якая ў значнай ступені адлюстроўвала падзелы у грамадстве. У сувязі з гэтым цікавым уяўляецца пытанне аб інтэрпрэтацыях у польскай гістарыяграфіі вынікаў перапісаў насельніцтва адносна канфесійнай структуры насельніцтва ў Заходняй Беларусі.

Адзін з першых перапісаў польскімі ўладамі быў праведзены акупацыйнай часовай адміністрацыяй яшчэ падчас польска-савецкай вайны ў 1919 г. на т. зв. Усходніх землях. Канфесійны падзел грамадства выглядаў наступным чынам: з 3 846 620 чалавек ахопленых перапісам 1 345 377 (35 %) былі каталікі, 1 982 893 (51,5 %) – праваслаўных, 462 078 (12 %) – іўдзееў, іншыя (1,5 %) – 56 272 чалавека [1, с. 26-27]. Асмалоўскі Е. пісаў, што галоўнай мэтай перапісу было прадставіць мясцовае насельніцтва як несвядомую, у нацыянальным сэнсе, масу, за выключэннем палякаў [3, с. 650]. Ромер Я. адзначаў вялікую карэляцыю паміж веравызнаннем і нацыянальнасцю ў насельніцтва. Ён развіваў думку аб уплыве ў рэгіёне двух цывілізацый – заходняй і ўсходняй. Першая вызначалася граніцай ад Гродна да Дынабурга, а другая – усходнім Палессем і р. Беразіной [2; с. 8].

Паводле перапісу 1921 г. канфесіі былі прадстаўлены наступнай колькасцю вернікаў: праваслаўе – 1,547 тыс., рыма-католікі – 1 487 тыс., іўдзеі – 406 тыс. і інш. Практычна адразу перапіс патрапіў пад крытыку навукоўцаў. Адзін з вядомых даследчыкаў польскіх перапісаў прафесар Варшаўскага ўніверсітэта і суарганізатар Галоўнай статыстычнай управы Польшчы Л. Кшывіцкі сцвярджаў, што нават час перапісу быў абраны няўдала, бо ішлі яўрэйскія святы, у выніку, традыцыйна настроеная частка грамадства адмовілася ўдзельнічаць у перапісу, што ў выніку дало нагоду і хрысціянам не перапісвацца, але падкрэсліваў, што на Ўсходзе Польшчы перапіс прайшоў спакойна. «Славутая пасіўнасць беларусаў праявілася ў поўным аб'ёме» [3, с. 133–134]. У цэлым для Л. Кшывіцкага перапіс 1921 г. і адлюстраваная ў ім нацыянальна-канфесійная структура адпавядалі рэчаіснасці.

Іншай думкі прытрымліваўся К. Сракоўскі, які сцвярджаў аб неабходнасці істотных паправак лічбаў на карысць беларусаў, бо вынікі спісу 1921 г. супярэчылі папярэднім перапісам, напрыклад у Расійскай імперыі, даследванням асобных навукоўцаў і ўвогуле, дадзеныя перапісу супярэчылі самім сабе. Па яго меркаванні, перапіс увогуле не ўлічваў беларусаў-католікаў, якіх было каля 25%. Лічба палякаў павялічылася амаль на 20% праваслаўных, бо з'явіліся палякі праваслаўнага веравызнання колькасцю каля 230 тыс., ці амаль 20% увогуле ўсіх палякаў у трох паўночна-ўсходніх ваяводствах. Непраўдападобна, паводле К. Сракоўскага, выглядала нацыянальна-канфесійная стукрура перапіса, калі беларусаў налічвалася менш чым праваслаўных, а палякаў больш чым католікаў. Розніца паміж праваслаўнымі і беларусамі складала каля 410 тыс., калі з гэтай лічбы адняць 8,7 тыс. рускіх і 156 тыс. украінцаў, якія відавочна былі праваслаўныя, то заставалася каля 244 тыс. праваслаўных, якія не былі залічаны да беларусаў, рускіх ці ўкраінцаў. Адначасова лічба палякаў на 193 тыс. была больш лічбы католікаў. З улікам таго, што літоўцы з'яўляюцца католікамі, то сярод католікаў атрымлівалася каля 952 тыс. палякаў. З улікам таго, што перапіс падаваў колькасць польскага насельніцтва ў 1 229 тыс., то каля 277 тыс.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

палякаў былі некаталіцкага веравызнання. К. Сракоўскі задаваўся пытаннем, хто маглі быць па веравызнанні гэтыя 277 тыс. палякаў? 47 тыс. іўдзеяў падала нацыянальнасць не яўрэйскую, рэшта аднак прыпадала на праваслаўных, але перапіс не ўлічваў ўвогуле групу беларусаў-католікаў, затое ўзнікала польскае праваслаўнае насельніцтва, што давала падставы даследчыку сцвярджаць аб заніжэнні колькасці беларусаў [4, с. 5–6].

У 1931 г. адбыўся так званы Другі агульны перапіс насельніцтва. Улады вырашылі абмінуць пытанне аб нацыянальнай прыналежнасці, але цікавіліся роднай мовай і веравызнаннем. Паводле вынікаў перапісу канфесійная структура выглядала наступным чынам: Беластоцкае ваяводства складалі 67,8 % – рыма-католікі, 18,5 % – праваслаўныя, 0,1 % – грэка-католікі, 12 % – іўдзеі, 0,9 % – евагелісты і 0,7 % – іншыя. Віленскае ваяводства: 62,5 % – рыма-католікі, 25,4 % – праваслаўныя, 0,1 % – грэка-католікі, 8,7 % – іўдзеі, 0,3 % – евагелісты і 3 % – іншыя. Навагрудскае ваяводства: 40,2 % – рыма-католікі, 51,3 % – праваслаўныя, 0,2 % – грэка-католікі, 7,8 % – іўдзеі, 0,1 % – евагелісты і 0,4 % – іншыя. Палескае ваяводства: 11 % - рыма-католікі, 77,4 % – праваслаўныя, 0,2 % – грэка-католікі, 10,1% – іўдзеі, 0,5 % – евагелісты і 0,8 % – іншыя [5, с. 357].

Польскія навукоўцы, звязаныя з Інстытутам даследванняў нацыянальных спраў не бачылі ў выніках перапісу ніякіх недахопаў. А. Крысінскі аналізуючы перапіс 1931 г. пісаў аб натуральнай тэрытарыяльнай экспансіі палякаў на ўсход, што з'яўлялася галоўным накірункам развіцця польскай палітыкі [6, с. 22].

Е. Тамашэўскі лічыў, што вынікі перапісу ва ўсходніх ваяводствах былі сфальсіфікаваны і прапаноўваў сваю дыскусійную ацэнку нацыянальна-канфесійнай структуры насельніцтва. 707 тыс. «тутэшых» з Палескага ваяводства паводле праваслаўнай канфесійнай прыналежнасці ¾ адносіў да беларусаў і ¼ да украінцаў. Колькасць праваслаўных і грэка-каталіцкіх вернікаў была на каля 800 тыс. больш, чым агульная колькасць беларусаў, украінцаў і рускіх. Зыходзячы з першанства канфесійнай прыналежнасці, Е. Тамашэўскі лічыў, што асобы, якія дэкларавалі праваслаўную, грэка-каталіцкую ці іўдзескую веру ў пераважнай большасці не маглі быць палякамі. [7].

Такім чынам, частка аўтараў, звяртаючыся да нацыянальнай праблематыкі не бачыла недахопаў у перапісах. Крытыкуючы арганізацыйныя ўмовы, тым не менш лічылі, што на вызначэнне нацыянальна-канфесійнага падзелу насельніцтва ўлады не мелі ўплыву, а колькасны рост польска-каталіцкага элементу на ўсходніх землях называўся натуральнай з'явай. У гістарыяграфіі прадстаўлены і крытычны погляд на праблему, які выкрывае і дэманструе ступень маніпуляцый улад з вызначэннем колькасці беларусаў-католікаў, або з'яўленнем праваслаўных палякаў ці катэгорыі «тутэйшых».

## Літаратура


1. Romer, E. Spis ludności na terenach administrowanych przez Zarząd Cywilny Ziem Wschodnich (grudzień 1919) / E. Romer. – Lwów – Warszawa, Książinca Polska T-wa Naucz. Szkół Wyższych, 1920. – 50 s.

2. Osmołowski, J. Wspomnienia z latach 1914-1921 / J. Osmołowski. – Biblioteka Narodowa. – Sygn. akc. 6798.

3. Krzywicki, L. Wartość wyników spisu powszechnego // Spisy ludności Rzeczypospolitej Polskiej 1921–2002. Wybór pism demografów / pod.red. Z. Strzeleckiego i T.Toczyńskiego. – Warszawa, 2002. – S. 131–144.




Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

4. Srokowski, K. Sprawa narodowościowa na kresach wschodnich / K.Srokowski. – Warszawa, 1924. – 56 s.

5. Skoczek, D. Struktura narodowo-wyznaniowa Kresów Wschodnich w Drugiej Rzeczypospolitej. Zarys problematyki / D. Skoczek // Prace naukowe Akademii im. Jana Długosza w Częstochowie. – 2010. – Z. XI. – S. 349–358.

6. Krysiński, A. Ludność polska a mniejszośći w Polsce w świetle spisów ludności 1921 i 1931 / A. Krysiński. – Warszawa, Drukarnia L. Nowaka, 1937 – 52 s.

7. Tomaszewski, J. Ojczyzna nie tylko Polaków : mniejszości narodowe w Polsce w latach 1918–1939 / J. Tomaszewski. Warszawa : Młodzieżowa Agencja Wydawnicza, 1985. – 223 s.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова